Год II. Лістапад № 12 (22)

Шлях Моладзі

... „Падымайся з нізін, сакаліна сям'я
Над крыжамі бацькоў, над курганамі!
Занімай, Беларусь маладая мая,
Свой пачэсны пасад між славянамі".

ЯНКА КУПАЛА.



ВІЛЬНЯ, 1930 г.

Беларуская Друкарня Ім. Францішка Скарыны — Вільня, Завальная вул. № 6

ЗЬМЕСТ № 12.

„Шлях Моладзі“

МЕСЯЧНАЯ ЧАСОПІСЬ БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ

Цана асобнага нумару 30 гр.

Падпіска на 3 месяцы . . . . 50 гр.
„ на паўгода . . . . . . 1 зл.
„ на год . . . . 2 зл

Заграніцу ўдвая даражэй.

Цана абвестак:

Цэлая старонка . . . . 40 зл.
Паўстаронкі . . . . 20 зл.
Адна чацьвертая старонкі . . 10 зл.

Абвесткі зьмяшчаюцца толькі на вокладцы.

Адрас Рэдакцыі: Вільня, Завальная № 6 — 10. (Wilno Zawalna 6 — 10).

Рэдакцыя адчынена ад гадз. 9 да 3-яй папаўдні.

Шлях Моладзі

МЕСЯЧНАЯ ЧАСОПІСЬ БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ.

Год II.	Вільня, Лістапад 1930 г.	№ 12 (22).

Канфіската „Шляху Моладзі“ № 11 (22).

25-га кастрычніка с. г. па загаду Гарадзкога Старасты на м. Вільню сканфіскаваны «Шлях Моладзі» № 11 (21) за м-ц кастрычнік за зьмяшчэньне вестак з украінскага жыцьця п. наз. «Разьвязаньне «Пласта», і «Апошнія падзеі ў Заходняй Украіне».

З прычыны цяжкога нашага матэр'яльнага палажэньня не маглі мы выдаць наступнага нумару зараз пасьля канфіскаты. Каб-жа ня быць у доўгу нашым падпішчыкам, гэты нумар выдаём у пабольшаным размеры.

У дзень 500-лецьця сьмерці Вялікага Князя Вітаўта.

(*27.X.1430 — 27.X.1930*)

500 гадоў таму назад, 27-га кастрычніка 1430 году, памёр Вялікі Князь Вітаўт.

Быў ён сынам Кейстута і Біруты, стрыечным братам Ягайлы, пазьнейшага караля Польшчы. Жыў Вітаўт у другой палове 14-га і ў першай 15-га сталецьця. Вітаўт быў князем, вялікім валадаром, вельмі добрым ваякам і гаспадаром Вялікага Княства Літоўскага, у склад якога ў тую пару ўваходзілі: Літва, Беларусь і Украіна. Вялікае Княства Літоўскае разцягалася ад Балтыцкага да Чорнага мора і ад ракі Буга да Акі.

У 1386 і 1413 г. уся Літва і Беларусь былі далучаны да Польшчы. Вялікі Князь Вітаўт не гадзіўся аднак з гэтым далучэньнем і стараўся праз цэлае сваё жыцьцё здабыць незалежнасьць для Вялікага Княства Літоўскага. Гэта-ж вельмі непадабалася палякам і яны ўсялякімі спосабамі стараліся перашкодзіць імкненьням Вітаўта.

Калі В. К. Вітаўт здолеў дайсьці да вялікае сілы і да-

вясьці Вялікае Княства Літоўскае да дабрабыту, хацеў аканчальна закончыць сваю працу для незалежнасьці свае дзяржавы, ня толькі фактычна, але і праўна, і дзеля гэтага жадаў ён сябе каранаваць каралеўскай каронай. Гэтаму аднак перашкодзілі палякі.

Вітаўт ня толькі змагаўся за самастойнасьць Вялікага Княства Літоўскага з аднымі Палякамі, — ён мусіў бараніць паўдзённую часьць ад вельмі частых і вялікіх нападаў татарскіх ордаў і заходнюю — ад паходу тэўтонскіх рыцараў, якія былі вялікай небясьпекай для літоўцаў, палякоў і беларусаў. І дзякуючы толькі Вітаўту, які стаў на чале літоўскіх і беларускіх войскаў, быў даны рашучы адпор грознай тэўтонскай навале ў слаўнай бітве пад Грунвальдам.

За часоў Вітаўта літэратурнай мовай Вялікага Княства Літоўскага перастае быць мова царкоўна-славянская, а стаецца мова жывая, беларуская, якая стаецца мовай адміністрацыі, суду, грамадзкага жыцьця і культуры ўсяе дзяржавы.

Агулам-жа кажучы, за часоў Вітаўта ў нашай старонцы панаваў лад, дабрабыт, а так-жа цьвіла культура і цывілізацыя.

Дык сягоньня, сьвяткуючы 500-леццае сьмерці Вялікага Князя Вітаўта, аддаймо яму чэсьць належную.

* * *

500 гадоў таму назад былі мы сільныя, шчасьлівыя, былі мы так-жа, як кажа паэт, „слаўныя ў краі і за краем". Сягоньня ня маем мы гэтага.

Але быць так далей не павінна!

Мы мусім усю нашу злыбяду перамагчы. І ў гэтым бязумоўна пакладаюцца ўсе надзеі на моладзь.

Дык мы, моладзь беларуская, разам з моладзяй братніх народаў украінскай і літоўскай дружна павінны змагацца за нашыя супольныя ідэалы, за шчасьце нашых народаў.

Я. Н.



Паміж другім і трэцім інтэрнацыяналам ідзе заўзятая барацьба. Сябры з 2-га інтэрнацыяналу, стоячы на грунце дэмократызму (соцыялісты), спагадлівей адносяцца да сяброў 3-га інтэрнацыяналу (комуністаў), затое комуністы, якія стаяць на грунце дыктатуры і сілы, растрэліваюць бяз ніякай літасьці сваіх таварышоў з 2-га інтэрнацыяналу, хоць тыя такія самыя работнікі і пролетары, як і комуністы.

Гэтак адбыўся вялікі падзел і ідзе гарачая спрэчка ў аднэй соцыялістычнай сям'і. Кажам — у аднэй сям'і, бо сапраўды, паміж соцыялістамі і комуністамі **ў тэорыі** бадай няма ніякай рожніцы: як адны так і другія ідуць да скасаваньня прыватнай уласнасьці, да зьнясеньня сям'і і ўсякай рэлігіі, а розьняцца паміж сабою, як мы ўжо казалі, толькі **ў практыцы**. Адны хочуць завесьці соцыялізм пры помачы эволюцыі і дэмократызму, а другія — пры помачы рэволюцыі і дыктатуры.

Вось і будзе ў галоўных рысах навука соцыялізму і комунізму. Прадставілі мы тут іхную навуку зусім об'ектыўна, нічога не дадаючы і нічога ня скрываючы. Крытыку гэтых кірункаў мы пакідаем да апошняга артыкулу, дзе будзем крытыкаваць усе палітычныя і грамадзкія кірункі, аб якіх ідзе гутарка ў гэтых артыкулах. **Ваг.**

Чаму зімой не выміраюць рыбы і расьлінасьць у водах?

Фізычныя правы матэрыі гласяць, што кожнае цела аграваючыся расшыраецца, а астываючы корчыцца і зьмяншаецца. Прыкладам можа тут быць нацягваньне гарачага абруча на кола, які астыўшы не звальваецца з яго. Адначасна целы, зьмяншаючы пад уплывам тэмпэратуры сваё абыймо, цяжэюць. Вось-жа вада падлягае гэтаму праву толькі да пэўнай граніцы. Калі мы яе гарачую будзем астуджаць, то яе цяжар будзе большаць, кожная напрыклад яе аднальковая мерка, маючая ніжэйшую тэмпэратуру, будзе цяжэйшай. Але гэтак з вадой дзеецца толькі да 4° C. Пры гэтай тэмпэратуры вада будзе найгусьцейшая, яе цяжар будзе найбольшы, бо калі будзем далей, ніжэй 4° C, астуджаць ваду, дык гушчыня яе і цяжар будзе малець. З гэтага ясна, што слаі вады цяплейшыя і зімнейшыя ад 4° C, як лягчэйшыя, будуць заўсёды ў вярху, а ў нізшых слаях вады, на дне, будзе панаваць амаль 4° C. Пры гэтым зімой, пры холадзе 0°, вада замярзае, замяняецца ў цела сталае — лёд. Лёд лягчэйшы ад вады, ніколі ня тоне і не дапушчае лішне холаду, каб далей астуджалася вада.

Калі б лёд быў цяжэйшы за ваду і тонуў-бы, — тады замест вады мелі-б мы ў вазёрах і рэках адзін лёд, а на дне ляжалі-б прыдушаныя жывёлы і вадзяныя і расьцінасьць. Аднак, дзякуючы мудрасьці Тварца, так ня ёсьць!

Я. М.

Аб народнай творчасьці.

Песьні.

У папярэднім нумары „Ш. М.“, хоць у кароткіх словах, сказаў я, што такое народная творчасьць і аб яе значэньні. Чяпер-жа народную творчасьць падзялю на аддзелы. I так да народнай творчасьці належаць: 1) дэмонічныя вераваньні, 2) богабражэньне аб прыродзе, народная мэдыцына (лячэньне), 3) чары, 4) народныя аповесьці (казкі), 5) народныя песьні, 6) загадкі і прыказкі, 7) відовішча драматычнае, ігры і гульні, 8) скокі (танцы) і 9) народная музыка. Усе гэтыя вышэй успомненыя аддзелы народнай творчасьці становяць скарбніцу беларускай культуры духовай.

Прыступаю перш да разгляду 5-га аддзелу народнай творчасьці, г. зн. да народных песьняў, бо гэтую галіну нашай духовай культуры лічу за найбольш цэнную і найбольш вартую таго, каб яе перш прастудыяваць.

Сярод беларускіх народных песьняў бадай галоўнае месца займаюць песьні **абрадавыя**. Абрадавыя песьні заўсёды зьвязаныя з спэцыяльным месцам, часам і асобамі. Абрадавыя песьні можам падзяліць на групы, а іменна: а) песьні сямейныя, б) песьні абрадава-гадавыя.

Песьні-ж сямейныя дзеляцца на: а) хрэсьбінныя, б) вясельныя, в) хаўтурныя.

Песьні хрэсьбінныя, якія сьпяваюць на Беларусі і да сяньняшняга дня, ужо ня маюць у сабе нічога асаблівага. Зьмест іх ня цікавы, часта зусім бязсэнсоўны; а словы часта цалком ня прыстойныя, ня гледзячы на тое, што пераважна хрэсьбінныя песьні пяюць жанчыны. Красы ў мэлёдыях таксама не знаходзім. Можа калісь і былі прыгожыя мэлёдыі, але ў сягоньняшнія часы мы іх ня можам даслухацца, бо гэтыя песьні пяюць бадай заўсёды ў падхмеленым стане. Хрэсьбінныя песьні складаюцца з кароценькіх урыўкаў, куплетаў; доўга пяяць іх госьці не маглі, бо, падвыпіўшы, часта перарывалі адну і пачыналі іншую песьню.

Апрача ўрыўкаў і прыпеўкаў, якія пяюцца для маткі і дзіцяці, пяецца цэлы цыкль песьняў бабцы, асабліва, калі ядуць ейную кашу і бліны, а таксама, калі возяць яе на баране.

Гледзячы з пункту мастацкага на хрэсьбінныя песьні, мы там не знаходзім нічога цэннага. Затое знаходзім там праўдзівую фатаграфію хрэсьбінных абрадаў, якія, праўда, шмат дзе зьмянілі сваю першапачатную форму. Аднак з гэтых, хоць часта, безсэнсоўных урыўкаў можам прачытаць гісторыю хрэсьбінных абрадаў. Дык вось і хрэсьбінныя песьні маюць пэўную сваю вартасьць.

Далей пераходзім да наступнай групы песьняў, якія злучаныя з абрадам вясельным. Гэтая група зьяўляецца найбагацейшай з усіх абрадавых песьняў.

Калі паглядзіш на гэта ўсё, сумна робіцца на душы, моладзь наша не прачувае зла і заместа таго, каб вясьці барацьбу з цемнатой, паніжае сябе яшчэ больш.

Час ужо найвышэйшы пазнаць дабро і зло! Не дадуць нам дабра варожыя палянізуючыя нас арганізацыі! Нам трэба закладаць свае беларускія арганізацыі, бо толькі праз іх мы здолеем перамагчы сваё гора і даведаемся, як трэба жыць, за кім ісьці і чаго трымацца.

Ліда Атрахімовіч.

НЯ ЎСЁ ДОБРАЕ, ШТО „ПРЫГОЖАЕ".

Ланская гм., Нясьвіжскага пав. Моладзь нашае вакаліцы вельмі мала разьвітая. Сьведчыць аб гэтым наступнае. У нашай старонцы зьявіліся інструктары польскіх колаў „млодзежы", адзетыя па сваёй форме. Форма ж гэта многа каму падабалася, а каб паводле яе ўбірацца пачалі слухаць інструктарскіх абяцанак і запісвацца ў гэтыя колы. Запісаўшысь да вышэй успомненых колаў, моладзь гэта ніякае культурнае працы не праводзе, адно панакладаўшы нібыта прыгожыя шапачкі і кашулі, крывяць сваю мову беларускую на польскую.

Моладзь разьвітая бязумоўна так не паступала-б. І вам, браткі, паступаць так ня можна! Ня трэба гнацца за рагаценькай шапкай і ня трэба крывіць свае, як кажуць, простае беларускае мовы і чужой, бо гэта не паможа нам у нашай барацьбе жыцьцёвай. Гэтыя-ж усялякія формы „Стшэльцаў", „Ставажышэнцаў" і інш., зроблены, каб прыцягваць неразвітую моладзь і потым палянізаваць яе.

Беларуская моладзь павінна закладаць і належаць да сваіх арганізацыяў, як Беларускі Інстытут Гаспадаркі і Культуры і працаваць супольна для падняцьця культуры свайго краю, ладзячы лекцыі, прадстаўленьні, чытальні.

Вяскоўы.

НЯ ЎСЮДЫ КЕПСКА.

м-ка Перабродзе і в. Цяцеркі, Браслаўскага пав. У 1927 г. прыпадкова быў я ў м-ку Перабродзе і пабачыў, як там добра йшла праца на ніве беларускага адраджэньня. Моладзь тамашняя сарганізавала свой беларускі хор, ладзіла часта вечарынкі, прадстаўленьні і г. д. У гэтым годзе быў я там таксама і заўважыў, што нажаль няма там цяпер таго, што было ў 1927 г. Моладзь застрашаная, ды напатыкаючы нават часта на перашкоды са стараны бацькоў пазбаўлена якое-небудзь культурнае працы.

Падобна дзеялася і ў в. Цяцерках. Моладзь сарганізаваная ў Гуртку Беларускага Інстытуту Г. і К. працавала сколькі магла для справы беларускай. Праца гэта пасьля была замерла, але не на доўга. Моладзь наша сільна духова ізноў

бярэцца за працу, думае ладзіць прадстаўленьні, вечарынкі і інш. Праўда, што вельмі цяжка і эта рабіць. Ня маем мы салі, а пры тым паліцыя знаходзіць вельмі шмат прычын, пасьля якіх сыплюцца пратаколы і на таго, хто гэта рабіў і ў чыёй гэта хаце рабілася. Гэта аднак не паўстрымае ахвоты нашае моладзі працаваць на карысьць Бацькаўшчыны.

Гэнрык Пяцюкевіч.

ДОБРЫ ПРЫКЛАД.

в. Расла, Жодзішнае гм., Вялейскага пав. У нас, як пэўне-ж і ўсюды, былі заварушыўшыся польскія „strzelcy“. Залажылі яны сваю баёўку і думалі, што ўдасца ім у нас пажывіцца. Але ня тое вышла, бо ня так даўно іх колка разваліласяя. Прычынай гэтага развалу было тое, што ў нашай вёсцы моладзь — гэта сьведамая беларуская маса. Ня гледзячы на тое, што яна належала да гэтае арганізацыі, моладзь сьмела прызнавалася беларусамі і працавала на карысьць беларускае справы.

Бывала хлопцы сойдуцца ў сьвятліцу і замест польскага гымну, калі грымнуць „Ад веку мы спалі“, дык аж рэха па вуліцы нясецца. На гуляньні ніколі ня ўжывалі яны мовы польскае. Не спадабалася гэта начальству „стральцоў“ і яно пачало рабіць даходы, хто ў гэтым вінават. Шукала, шукала, паліцыю прысылала і такі знашлі „віноўнага“, гэта І. Ш. Тады прыехаў капітан з Вялейкі і сказаў, што выкідае з радоў „strzelców“ І. Ш. На гэта ўсе хлопцы крыкнулі, што і яны выходзяць з гэтага кола і кола гэна развалілася.

Вось табе беларуская моладзь прыклад з Раслаўскае моладзі.

Пасьля гэтага ўся наша моладзь пастанавіла запісацца ў сябры Гуртка Бел. Інстытуту і такім чынам рук не апускаць, а яшчэ больш працаваць для дабра нашага беларускага народу.

Б — к.

10-я ўгодкі заснаваньня Беларускага Студэнскага Саюзу ў Вільні.

У гэтым годзе прыпадаюць 10-я ўгодкі заснаваньня Беларускага Студэнскага Саюзу ў Вільні. 23-га лістапада Бел. Студ. Саюз ладзіў сьвяткаваньне гэтага Юбілею, у часе якога была наладжана ўрачыстая акадэмія ў унівэрсытэце ў салі Сьнядэцкіх і канцэрт-баль.

Сьвяткаваньне гэта выклікала вялікае зацікаўленьне ня толькі сярод беларускага студэнства і моладзі, але і старэйшага грамадзянства і дзеля гэтага на акадэміі сабралася многа людзей.

Акадэмію распачаў старшыня Б. С. С. студ. К. Глін-

скі, па прамове якога хор адсьпяваў студэнскі гімн „Gaudeamus igitur“. Пасьля выступіў рэктар унівэрсытэту праф. др. Янушкевіч і вітаў Б. С. С., жадаючы пасьпеху ў ягонай працы. Пасьля прамовы рэктара былі прачытаны два рэфэраты. Студ. Ст. Станкевіч прачытаў рэфэрат п. н. „Гісторыя беларускага студэнскага руху“, у якім нарысаваў палажэньне і працу беларускага студэнства за часоў царызму і сягоньня, а студ. А. Бартуль прачытаў рэфэрат п. н. „Беларускі Студэнскі Саюз за 10 год істнаваньня“, падкрэсьліваючы між іншым, як важную ідэолёгічную праяву ў беларускім студэнстве, яго супрацоўніцтва з студэнтамі літвінамі і ўкраінцамі.

Далей-жа віталі Б. С. С. кс. Гадлеўскі ад Бел. Інстытуту Г. і К., гр. А. Трэпка ад „Цэнтрасаюзу“, гр. А. Луцкевіч ад Бел. Навуковага Т-ва, інж. В. Лаўскі ад імя Аб‘яднаньня Беларускіх Студ. Арганізацыяў у Празе Чэскай (Арганізацыя гэта гуртуе ўсе бел. студ. арганізацыі, а на чале яе стаіць інж. В. Лаўскі); Васіль Багдан Крахмалюк — ад Кружка Студэнтаў Украінцаў у Вільні; а такжа вітаў старшыня Літоўскага Студ. Саюзу. Ад палякаў студэнтаў віталі: студэнт Гэнрык Дэмбінскі — ад імя студэнтаў палякаў з зямель бышага Вял. Кн. Літоўскага і старшыня польскае студ. арг. „Legjon Młodych“. Ад імя беларускае моладзі згуртаванае каля час. „Шлях Моладзі“ вітаў гр. Я. Найдзюк. Пасьля гэтага сэкрэтар Б.С.С. Ст. Станкевіч прачытаў надасланыя ў вялікім ліку (больш паўсотні) прывітаньні ад розных арганізацыяў беларускіх, украінскіх, нямецкага студэнскага саюзу і ад паасобных адзінак.

Па гэтым пасьля адсьпяваньня беларускага народнага гімну „Не пагаснуць зоркі ў небе“ акадэмія закончылася.

Трэба так-жа адзначыць, што на час акадэміі ў унівэрсытэце была наладжа выстаўка беларускае студэнскае прэсы.

Акадэмія была вельмі добра сарганізаваная і на прысутных зрабіла дужа добрае ўражаньне.

У часе гэтае-ж акадэміі беларускае студэнства выразна выявіла сваю незалежніцкую ідэолёгію і свае шчырыя імкненьні да будаваньня лепшае будучыні нашае Бацькаўшчыны Беларусі.

Другой часьцю сьвяткаваньня быў канцэрт-баль, які адбыўся ў гэтым-жа дню ў салі „Апольлё“. У часе канцэрту выступаў хор пад кіраўніцтвам гр. Валынчыка, які дужа прыгожа выканаў некалькі беларускіх песень. Дужа цікавы быў танец-балет „Вызваленьне“ ўложаны студ. Сарокай.

Што да канцэрту-балю, то трэба заўважыць, што назоў гэты можа ня зусім удалы. Назоў „баль“ ня надта прыемны для вуха беларускага беднага грамадзянства. Лепш мо‘ было-б назваць гэты „баль“ напр. вечарынай.

Агулам аднак сьвяткаваньне адбылося дужа добра.

(З.)

Хроніка

З беларускага жыцьця.

Беларусы і выбары ў польскі Сойм і Сэнат. У сё·етніх выбарах у поль·кі Сойм і Сэнат Беларусы йшлі разьбіўшыся на многа партыяў, і так было іх аж некулькі. Была партыя самая левая (камуністычная), якой спіскі былі ўніважненыя; Блёк Украінска-Беларускі (незалежнікі), якога сьпіскі таксама часткова былі ўняважнены; „Цэнтрсаюз" (беларускія палёнофілы). Рэзультаты выбараў ёсьць дужа сумныя, бо ў Сойм ад Беларусаў прайшоў толькі адзін пасол Фабіян Ярэміч па дзяржаўным сьпіску Украінска-Беларускага Блёку, а ў Сэнат не прайшоў ані адзін Беларус. Трэба зазначыць, што ў 1922 годзе Беларусы правялі ў Сойм 12 сваіх паслоў, а ў 1928 годзе 8 паслоў. Вынік гэтых выбараў зьяўляецца вельмі добрай навучкай для павадыроў беларускага руху, а таксама сьведчыць аб цемнаце нашай вёскі і аб тым, як яшчэ многа трэба працаваць для ўсьведамленьня Беларускага Народу.

Сьвяткаваньне юбілею В.К. Вітаўта. У дзень 500-леццця сьмерці Вялікага Князя Вітаўта 27.X.1930 г. літоўска-беларускі „Юбілейны Камітэт, у склад якога уваходзілі ад беларусаў кс. Ад. Станкевіч, б. сэнатар В. Багдановіч, пасол Ф. Ярэміч і др. Б. Грабінскі, а ад літоўцаў кс. праф. Краўяліс, кс. пралат Віскант, др. Альсэйка, гр. Сташыс і дыр. Шыксніс, ладзіў у Вільні ўрачыстае сьвяткаваньне. Сьвяткаваньне распачалося набажэнствам у касьцеле сьв. Мікалая, у часе якога аткрыта памятнік Вялікаму Вітаўту. Пасьля аткрыцьця былі сказаны два казаньні: палітоўску казаў кс. Чыбірас, а пабеларуску кс. Гадлеўскі. А гадзіне-ж 7-ай вечарам адбылася ўрачыстая акадэмія ў салі „Apollo". На акадэміі былі прачытаны тры рэфэраты: два палітоўску і адзін пабеларуску. Палітоўску чыталі кс. праф. Краўяліс і др. Альсэйка, а пабеларуску кс. Адам Станкевіч. Пасьля рэфэратаў выступаў літоўскі хор і салісткі.

Учасе акадэміі саля была перапоўнена публікай.

Выезд б. павадыроў „Грамады." Польскія газэты падаюць, што б. павадыры „Грамады" Б. Тарашкевіч,

Сымон Рак-Міхайлоўскі, Мятла і Бурсэвіч, нядаўна выехалі ў Гданск, а адтуль далей заграніцу, быццам у Бэрлін.

10-я ўгодкі Слуцкага Паўстаньня. Сёлета прыпадаюць 10 я ўгодкі слаўнага беларускага Слуцкага Паўстаньня. Дзеля належнага адсьвяткаваньня Бел. Студ. Саюз 8-га сьнежня ладзіць акадэмію.

Судзяць і канфіскуюць. 11-га лістапада с. г. у Віл. Апэляц. Судзе разглядалася справа жодзішных парафіян, Вялейскага пав., Ст. Грыба і М. Ярмака, абвінавачаных у тым, што сьпяваючы беларускія касьцельныя песьні перашкаджалі адпраўляць набажэнства. Апэляцыйны Суд зьменшыў кару Акружнога Суду і даў Ст. Грыбу 3 м. арышту, а М. Ярмаку 2 м.

— 13-га лістапада с. г. Апэляцыйны Суд у Наваградку разглядаў справу б. сэнатара Рагулю і ў выніку зацьвердзіў прысуд Акруж. Суду, які засудзіў яго на 2 г. цяжкой турмы.

— 14-га лістапада с. г. па загаду Гарадзкога Старасты на м Вільню паліцыя сканфіскавала № 4 „Беларускага Клічу“ — орган Беларускага Выбарнага Камітэту № 11.

— 22-га лістапада с. г. у Віл. Акружн. Судзе разглядалася справа рэд. „Ш. М.“ Мар'яна Пецюкевіча, абвінавачанага па 129 арт. К. К., за памяшчэньне ў № 4 „Ш. М.“ вершу „Паўстань Беларусь“, які ў сваім часе быў сканфіскаваны. Справу гэту Суд адлажыў.

З Польшчы.

Вынік выбараў у Сойм і Сэнат. 16 лістапада с. г. адбыліся выбары ў Сойм, у выніку якіх сьпісак № 1 — Безпартыйны Блёк Супрацоўніцтва з Урадам атрымаў 248 мандатаў, № 4 „Строніцтво Народовэ“ (эндэцыя) 64 м., № 7 „Цэнтралеў“ (левыя апазыцыйныя польскія партыі) 79 м., № 11 „Украінска-Беларускі Выбарны Блёк 21 м. (з чаго 20 паслоў украінскіх і 1 пасол беларускі), № 12 Немцы 5 м., №№ 14, 17 і 18 Жыды 7 м., № 19 Каталіцкі Блёк 14 м. і №№ 22 і 23 камуністы 6 мандатаў.

23-га лістапада адбыліся выбары ў Сэнат, у выніку якіх сьпісак № 1 Безпартыйны Блёк атрымаў 76 м,; № 4 — 12 м.; № 7 — 14 м.; № 11 — 4 м.; № 12 — 3 м. і № 10 — 2 м. З гэтага бачым, што найбольш мандатаў атрымаў урадавы сьпісак № 1, здабываючы гэтым большасьць, а найбольш страціў сьпісак № 7 і нацыянальныя меншасьці.

З заграніцы.

Што робіцца ў С.С.Р.Р. Нядаўна ў газэтах паявіліся весткі, што быццам у С.С.Р.Р. паўстала рэвалюцыя і што Сталіна цяперашняга дыктатара С.С.Р.Р. забілі, а яго месца заняў Варашылаў, ваенны камісар. Весткі гэтыя аказаліся безпадстаўныя, бо як падаюць тэлеграмы з Масквы ў С.С.Р.Р. пануе надалей Сталін. Аднак падаюць гэтыя-ж самыя тэлеграмы, што ў савецкай арміі пануе незадаваленьне з сучаснага палажэньня.

Наша пошта.

Юліяну Сергіевічу. Матэр'ялы атрымалі, дзякуем, „Ш. М." будзем высылаць; па „Віншаваньне" пойдзем, толькі ня ведама, ці аддадуць нам.

С. Машары. Пісьмы Вашы абодва атрымалі і з верш прысланага матэр'ялу часткова скарысталі. Залеглыя нумары „Шляху Моладзі" высылаем паўторна, мы кожны нумар высылаем акуратна; дамагайцеся на пошце, з прысланага скарыстаем у наступных нумарох.

Алекс. Мілевічу. Матэр'ялы і ноты атрымалі, дзякуем, калісь выкарыстаем, „Шлях Моладзі" на прысланыя адрасы высылаем.

Г. Потрубейку. Усе залеглыя нумары „Ш. М." высылаем, а так-жа і далейшыя Вам і напрысланыя адрасы будзем высылаць. Чакаем падпіскі.

Янку Тутэйшаму. Пісьмо атрымалі, дзякуем, увагі Вашы вельмі слушныя, пастараемся іх выкарыстаць, друкуючы там, дзе можна будзе.

Анат. Сахарчуку № 7 і 8—9 „Ш. М." высылаем і чакаем падпіскі.

Сірацe. Карэспандэнцыю атрымалі, надрукуем у наступным нумары. Чэсьць і слава маладым барацьбітом.

Пал. Алекса. Два пісьмы, а разам з імі і матэр'ялы атрымалі, дзякуем, добрыя, будзем друкаваць у наступных нумарох. Пробныя нумары высылаем.

М. Рачэнюку. „Ш. М." і календарык вышлем.

Я Салаўю. Матэр'ялы атрымалі, дзякуем, будзем друкаваць. „Ш. М" высылаем і будзем высылаць акуратна. № 2 і 7 высылаем паўторна.

Т. Асіповічу. Пісьмо атрымалі, верш паправіўшы надрукуем. Просьбу споўнілі.

Г. Рудко. Пробныя нумары выслалі, чакаем падпіскі.

В. Дубов. Пробныя нумары высылаем і чакае падпіскі.

Вінцукевічу М. Вершы атрымалі, дзякуем. Добрыя, будзем друкаваць. „Шлях Моладзі" выслалі і далей будзем высылаць.

І. Пупіну. Матэр'ялы атрымалі, па магчымасьці выкарыстаем. „Ш. М." высылаем. Песьні народныя просім запісваць толькі чыста беларускія расейскія і польскія нам не патрэбныя.

Маладому. Пасьля атрыманьня Вашае карэспандэнцыі праз нейкі, час атрымалі мы пісьмо з Вашае стараны падпісанае быццам праз Вас, у якім было напісана, што Вы ўжо атрымалі перамогу ў самаўрадавых выбарах. Карэспандэнцыю пастараемся надрукаваць, яна многа чаго гаворыць.

Я. Сухадольскаму з пад Тургель. Карэспандэнцыю зьмесьцім у далейшых нумарох.

Мікол.-Круцёлцы Матэр'ялы, атрымалі памагчымасьці надрукуем.

Макаўлянцу. Матэр'ялы атрымалі, будзем карыстаць. Вершы вельмі слабыя. „Ш. М." № 2 і 5 выслалі. № 4 сканфіскаваны.

Фані. Карэспандэнцыю, адрасы, друкі атрымалі, просьбу споўнілі, За ўсё дужа дзякуем.

Падпісную плату на „Шлях Моладзі" атрымалі ад: Шайка Ул., Пасюты, Паўленя, Кс. К. Кулака па 4 зл.; Грыневіча 3 зл.; Камлача М. 2 зл. 50 гр.; Кс. Ул. Савіцкага, Дзешкі Ул., Сенкевіча, Гінько Яна. Чаплінскага, Качанюка М., Навіцкага Ю. па 2 зл.; Пылінскага 1 зл. і 20 гр.; Сухадольскага 1 зл. – усім шчыра дзякуем, „Ш. Моладзі" высылаем.

СЯБРЫ РЭДАКЦЫЙНАЙ КАЛЕГІІ:

Язэп Найдзюк, Ізабэля Тумаш і Альфонс Шутовіч

Рэдактар Мар'ян Пяцюкевіч. Выдавец Янка Багдановіч

П А Д З Я К А.

Гэтым Рэдакцыйная Калегія „Шляху Моладзі“ шчыра падзякуе Паважанаму Кс. Ад. Станкевічу за ахвяраваньне паперы на Календарык „Ш. М.“, Кс. Др. Ст. Глякоўскаму за ахвяраваньне 20 зл., і Грамадзяніну Леаніду Шыдлоўскаму з Баранавіч за ахвяраваньне 5 зл. на выдавецтва „Шляху Моладзі“, а так-жа Паважаным беларускім мастаком: Я. Драздовічу і Ул. Паўлікоўскаму: першаму за бязплатнае выкананьне на ліналеум арнамантаў (заставачак) да „Шляху Моладзі“, другому за такое-ж выкананьне вокладкі да Календарыка „Шляху Моладзі“ на 1931 г. і арнамантаў да „Шляху Моладзі“.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ.

Ад Рэдакцыйнае Калегіі.

Рэдакцыйная Калегія падае да ведама, што:

1. Падпішчыкам, якія не аплацілі падпіскі за 1930 г., ад гэтага нумару высылка часопісі будзе ўстрымана

2. Каб даць магчымасьць падпішчыкам аплачваць акуратна падпіску і каб бяднейшая моладзь магла выпісваць „Шлях Моладзі“, Рэдакцыйная Калегія зьменшыла падпіску. Такім чынам падпіска на „Шл. М.“ на 1931 г., каштуе ўсяго **2 зл.**, на паўгода **1 зл.**, і на 3 месяцы **50 гр.**

3. Да Каляд усім акуратным падпішчыкам і супрацоўнікам будуць высланы два календарыкі (календарык-нотас і сьценны), як бязплатны дадатак да „Ш. М.“.

4. „Шлях Моладзі“ на далей будзе выходзіць акуратна, што-месяц.

Прытым Рэдакцыйная Калегія зьвяртаецца з просьбай:

1. Прысылаць падпіску на „Шлях Моладзі“ на 1931 г.

2. Дапамагчы нам распаўсюджваць „Шл. М.“ і здабываць як найбольш падпішчыкаў.

3. Зьбіраць і прысылаць ахвяры на выдавецкі фонд „Шляху Моладзі“.

4. Прысылаць творы да друку і весткі з жыцьця беларускае моладзі. (Пры тым просім пісаць матэр'ялы да друку: вершы, апавяданьня, стацьці, карэспандэнцыі і інш. на аддзельных кавалках паперы, пажадана на палове канцэлярыйнага, ці сшыткавага аркуша, разрэзанага па палове ўдоўж і толькі на аднэй старонцы).

5. У выпадку не атрыманьня часопісі просім складаць на сваей пошце скаргу да Дырэкцыі Пошт і Тэлеграфаў у Вільні, павядамляючы аб гэтым Рэдакцыю.

Верым, што Паважаныя Грамадзяне прыхільна аднясуцца да нашае просьбы і споўняць свой грамадзкі абавязак.

Рэдакцыйная Калегія
«Шляху Моладзі».

Pierasyłka apłačana ryčałtam.

ХУТКА ВЫЙДЗЕ З ДРУКУ

Календарык на год **1931**

„ШЛЯХУ МОЛАДЗІ“

Календарык гэты абымае стары (праваслаўны) і новы (каталіцкі) стыль і каштуе ўсяго 30 грошай.

Кожны падпішчык, які аплаціў падпіску за 1931 г. кагендарык гэты атрымае бязплатна. Выпісаць можна з кнігарні „Пагоня“, Вільня, Людвісарская вул. № 1 і з выд. „Шляху Моладзі“ Вільня, Завальная 6—10.

Грамадзяне! Выпісвайце, чытайце і пашырайце «Шлях Моладзі»!

За прыкладам мінулых гадоў

Беларуская Кнігарня „ПАГОНЯ“
ладзіць танную прадажу
беларускіх кніжак.

Празначаныя на танную прадажу кніжкі, а такжа і танная цана іх абазначаны чырвоным атрамантам у каталёзе кнігарні „Пагоня“, які гэта кнігарня высылае бясплатна.

Грамадзяне! Карыстайце з рэдкай магчымасьці купіць танна беларускую кніжку, — выпісвайце каталёг, выбірайце ў ім патрэбныя Вам кніжкі і выпісвайце іх!

Кніжкі на правінцыю кнігарня „Пагоня“ высылае пасьля атрыманьня ўсей вартасьці заказу, або накладнай платай (za pobraniem).

Перасылка на кошт заказчыка.

Бел. Кнігарня „Пагоня“, Вільня, Людвісарская № 1.